# Цьютарскае суправаджэнне праектна-даследчай дзейнасці навучэнцаў

**К. В. Калода,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі
гімназіі № 14 г. Мінска

Практыка паказвае, што якой бы самастойнасцю ні валодаў чалавек, узнікаюць сітуацыі, у якіх асоба мае патрэбу ў суправаджэнні з боку пэўнага спецыяліста (псіхолага, псіхатэрапеўта, сацыяльнагаыя педагога, коўча і г. д.). Асаблівае месца ў гэтым шэрагу належыць цьютару.

Цьютар – новая прафесія для адукацыі. Паслугі цьютара досыць запатрабаваныя. Адукацыйнае асяроддзе, якое сёння актыўна рэфармуецца, мае патрэбу ў новым спецыялісце, які не будзе, як настаўнік, перадаваць веды, а дапаможа навучэнцам выбудоўваць індывідуальную адукацыйную траекторыю. Суправаджэнне цьютара прадугледжвае выяўленне і «прасоўванне» цікавасці цьютаранта (суправаджэнца). Цьютар стварае празмерную адукацыйную прастору, насычаную мноствам прапаноў, якія патэнцыяльна могуць быць цікавыя навучэнцу, затым ён суправаджае рух цьютаранта ў гэтай прасторы.

Змест і арганізацыйныя ўмовы рэалізацыі праграмы цьютарскага суправаджэння ў школе могуць быць розныя. Найбольш адпаведнымі зместу цьютарскага суправаджэння з'яўляюцца асобаснаарыентаваныя педагагічныя тэхналогіі.

**У групе непаспяваючых навучэнцаў** цьютар стварае ўмовы для рэалізацыі індывідуальных асаблівасцей і магчымасцей асобы, дапамагае дзіцяці выбудаваць індывідуальны шлях развіцця. Гаворка пойдзе хутчэй аб выяўленні і карэкцыі псіхалагічных праблем дзіцяці. Менавіта пераадольваючы ўсе дзіцячыя страхі, аказваючы прафесійную прадметную падрыхтоўку, цьютар дапамагае такім дзецям здабыць упэўненасць у сабе, у сваіх сілах і ведах. А апынуўшыся ў камфортнай псіхалагічнай атмасферы і прафесійным асяроддзі, справіўшыся з сабой і пераадолеўшы сябе, вучань здольны дабіцца многага.

**Мэта работы з групай адораных навучэнцаў** – стварэнне спрыяльных умоў

для развіцця адораных дзяцей, задавальненне патрэбы ў новай інфармацыі, дапамога ў самараскрыцці.

Можна прагназаваць наступныя вынікі:

1. Рашэнне індывідуальных задач (усвядомленае фарміраванне (або карэкцыя) індывідуальнага стылю мыслення, пазнавальнай і творчай дзейнасці).

2. Павышэнне эмацыянальнай устойлівасці, развіццё настойлівасці і цярпімасці як рыс характару; з'яўленне новых творчых ініцыятыў; карэкцыя камунікатыўнай сферы;

3. Сацыялізацыя, пасяховасць (у публічных выступленнях, конкурсах, алімпіядах і інш.)

4. Развіццё ў вучняў навыкаў самастойнай адукацыйнай дзейнасці.

5. Стварэнне ўмоў для прэзентацыі, аналізу дасягненняў навучэнцаў.

6. Ажыццяўленне сацыяльна-прафесійнага самавызначэння старшакласнікаў.

**Мадэль цьютарскага суправаджэння праектна-даследчай дзейнасці навучэнцаў на прыкладзе арганізацыі даследавання і выканання індывідуальнай даследчай працы па беларускай мове і літаратуры.**

На *дыягнастычным* этапе ажыццяўляецца выбар галіны даследавання: беларуская мова або беларуская літаратура. Цьютар вызначае інтарэсы вучня, праводзіць індывідуальныя гутаркі; цьютарант вылучае найбольш цікавыя галінамі даследавання.

На *праекцыйным* этапе выбіраюцца тэмы даследавання, вызначаюцца гіпотэзы, мэты і задачы. Цьютар фарміруе прыкладны пералік тэм для даследаванняў, праводзіць кансультацыі. Цьютарант выбірае тэму (праблему) даследавання, якая можа быць звязаная з будучай прафесіяй, напрыклад.

*Рэалізацыйны* этап умоўна можна таксама падзяліць на часткі. Спачатку дзейнасць цьютара і цьютаранта накіравана на стварэнне плана і адбор матэрыялу. Цьютар вызначае спіс літаратуры для вывучэння і выбірае методыку даследавання, рыхтуе матэрыял для правядзення доследу. Затым намаганні абодвух канцэнтруюцца на стварэнні тэарэтычнай агляднай часткі працы. Цьютар дапамагае апрацаваць і класіфікаваць атрыманыя дадзеныя. Навучэнец вызначаецца з

крыніцамі атрымання інфармацыі (пералік літаратуры, розных методык; сайты), займаецца вывучэннем матэрыялу па тэме.

На наступным этапе праца накіравана на стварэнне практычнай часткі цьютарант заняты практычнымі даследаваннямі, а цьютар кантралюе ход выканання праекта-даследавання.

На завяршальнай стадыі рэалізацыйнага этапу цьютарант самастойна працуе па тэме даследавання, цьютар дыстанцыруецца, але мабільна рэагуе на праблемы (пошук навуковага кансультанта, магчымасць працаваць з інш. удзельнікамі). Затым матэрыялы даследчай працы абагульняюцца і рыхтуецца абарона вынікаў выкананай працы.

*Аналітыка-рэфлексіўны* этап характарызуецца ацэнкай выніковасці праведзенай работы, вызначэннем правільнасці абранай адукацыйнай траекторыі, , цьютарант выяўляе цяжкасці і перспектывы для далейшай даследчай дзейнасці.

На *абагульняючым* этапе цьютарант з прэзентацыяй даследчай працы ўдзельнічае ў конкурсах і навуковых канферэнцыях розных узроўняў. Цьютар аказвае дапамогу ў распрацоўцы і рэалізацыі праграмы самаадукацыі і самаразвіцця.

**Прыклад арганізацыі даследавання па беларускай літаратуры «Выражэнне светаўспрымання і светаадчування чалавека праз зменлівасць пор года ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля» і рамане А. С. Пушкіна «Яўгеній Анегін».**

На *дыягнастычным* этапе ў ходзе гутаркі з цьютарам цьютарант адзначыў, што вельмі любіць класічную беларускую і рускую літаратуру, любімымі аўтарамі яго з'яўляюцца Колас і Пушкін. Творчасць вялікіх класікаў і хацеў бы даследаваць цьютарант.

Вызначыўшы кола інтарэсаў, цьютар адзначыў, што абраная для даследавання тэма не з'яўляецца новай ні ў рускай, ні ў беларускай літаратуры. Але зыходзячы з цікавасці падапечнага, цьютар прапануе выбраць канкрэтныя творы – паэму “Новая зямля” і раман у вершах “Яўгеній Анегін”, бо ў творчасці кожнага вялікага майстра слова ёсць самы значны твор, у якім з выключнай мастацкай сілай ўвасобіліся маральныя і эстэтычныя ідэалы аўтара як асобы. У творчасці А. Пушкіна такім

творам з'яўляецца раман у вершах «Яўгеній Анегін», а ў Коласа – паэма «Новая зямля».

Такім чынам, праблемнае поле было вызначана, але яно ўсё яшчэ заставалася вельмі шырокім, а для напісання даследчай працы ў школе трэба звузіць рамкі, каб праца не атрымалася размытай і неканкрэтнай.

Выхад знайшоў цьютарант: ён адзначыў, што яму падабаюцца радкі з рамана, якія вядомыя ўсім: *Уж небо осенью дышало,//Уж реже солнышко блистало,// Короче становился день,/Лесов таинственная сень / С печальным шумом обнажалась.//Ложился на поля туман, //Гусей крикливых караван Тянулся к югу:// приближалась/ Довольно скучная пора.*

Пушкін – вядомы майстар яркіх пейзажных замалёвак, якіх вялікае мноства ў яго рамане. Не менш іх і ў паэме Коласа. Таму рабочая тэма была сфармулявана так: «Пейзаж у рамане А. С. Пушкіна «Яўгеній Анегін» і паэме Я. Коласа «Новая зямля». Тэма, якую вызначылі, вылучалася навізной і актуальнасцю. Актуальнасць заключаецца ў тым, што зараз востра стаіць пытанне аб сувязі чалавека і прыроды, яго свядомых, беражлівых адносінах да яе. Мастацкія творы вялікіх майстроў слова здольныя абудзіць у свядомасці людзей беражлівыя адносіны да прыроды, роднай зямлі, пачуццё нацыянальнай годнасці.

Для напісання працы былі пастаўлены канкрэтныя мэты і задачы: параўнаць вобразы прыроды і яе функцыі ў абраных творах.

*Рэалізацыйны* этап з'яўляецца вельмі працяглым і самым складаным, таму яго можна разбіць на некалькі падэтапаў.

Спачатку цьютарант павінен перачытаць мастацкія творы і азнаёміцца з крытычнай літаратурай. Вынікам праведзенай работы павінна стаць уступная тэарэтычная частка працы, дзе знойдуць адлюстраванне асноўныя гіпотэзы.

*«Яўгеній Анегін», па словах Бялінскага, «энцыклапедыя рускага жыцця».*

*«Новая зямля» Якуба Коласа – класічны твор беларускай літаратуры, на думку А. Лойкі, «эпахальная энцыклапедычная паэма нацыянальнаага жыцця».*

*«Карціны прыроды і ў Пушкіна, і ў Коласа – адлюстраванне эпохі, мера часу і велічнасці чалавека, выражэнне светаўспрымання і светаадчування аўтара...»*

Далей неабходна адабраць, апрацаваць і класіфікаваць матэрыял для даследавання. Для гэтага цьютаранту прапануецца на асобных картках (лістах) выпісаць прыклады апісання прыроды з мастацкага тэксту. Для рашэння пастаўленых задач прымяняліся наступныя метады даследавання: назіранне, параўнальны аналіз, аналогія, абагульненне. Усё гэта знайшло адлюстраванне ў першым раздзеле «Кампаратывістыка як адметная галіна літаратуразнаўства», дзе раскрываецца паняцце «Кампаратывістыка» як адзін з галоўных навуковых метадаў, калі шляхам параўнання аднаўляецца агульнае, асаблівае ў з’явах, заканамернасцях іх развіцця, які шырока выкарыстоўваецца ў гуманітарных навуках (мовазнаўстве, літаратуразнаўстве, гісторыі, этнаграфіі, фалькларыстыцы). Разглядаюцца разнавіднасці параўнальнага метаду.

Выконваючы заданне, цьютарант заўважыў, што ў пісьменнікаў поры года апісаны па-рознаму, а стаўленне аўтараў да іх неадназначнае. Дадзенае назіранне лягло ў аснову класіфікацыі, дапамагло канчаткова сфармуляваць тэму даследавання.

| Поры года | **Пушкін** | **Колас** |
|---|---|---|
| Восень | *Уж небо осенью дышало,<br>Уж реже солнышко блистало,<br>Короче становился день,<br>Лесов таинственная сень<br>С печальным шумом обнажалась.<br>Ложился на поля туман,<br>Гусей крикливых караван<br>Тянулся к югу: приближалась<br>Довольно скучная пора.* | *На ніцях белай павуціны<br>Прыводзяць восень павучкі .<br>Яе красёнцы, чаўначкі<br>У моры лесу, мільганулі<br>І лісце ў багру апранулі;<br>І з кожнай лісцевай галоўкі<br>Глядзіць твар восені-свякроўкі.* |
| Зіма | *Зима!..Крестьянин, торжествуя,<br>На дровнях обновляет путь<br>Его лошадка, снег почуя,<br>Плетётся рысью как-нибудь;<br>Бразды пушистые взрывая,<br>Летит кибитка удалая;<br>Ямщик сидит на облучке<br>В тулупе, в красном кушаке* | *Стаіць над лесам шум маркотны;<br>Па небе хмары як палотны,<br>Паўночны вецер рассцілае,<br>І бель над далямі звісае,<br>І ціха стане на падворку,<br>І лес жалобную гаворку,<br>Свой гоман восені канчае<br>І моўчкі зіму сустракае* |
| Вясна | *Гонимы вешними лучами,<br>С окрестых гор уже снега<br>Сбежали мутными ручьями<br>На потоплённые луга.<br>Улыбкой ясною природа<br>Сквозь сон встречает утро года.* | *Вясна была яшчэ ў пачатку,<br>Але снягі ўжо раставалі,<br>І дружна ў поле балбаталі<br>Раўкі, рачулкі, і ў грамадку<br>Яны ваду сваю злівалі,<br>Ад сну гаі, лясы будзілі* |

| | | |
|---|---|---|
| | | *І людзям душу весялілі.* |
| Лета | *Карикатура южных зим.* | *Пакаты ўзгор'я і курганы.*<br>*Уздзелі чырвані кароны* |

Класіфікаваўшы адабраны матэрыял, цьютарант прыступае да афармлення асноўнай часткі працы, дзе адлюстроўваюцца важныя палажэнні, назіранні і робяцца высновы. Разам з цьютарам распрацаваны наступны план работы над практычнай часткай: у другім раздзеле «Поліфункцыянальнасць прыроды ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля» і рамане А.С. Пушкіна «Яўгеній Анегін» былі вызначаны мастацкія функцыі пейзажных замалёвак:

1. Прырода як фон дзеяння.
2. Сюжэтабудаўнічая функцыя пейзажу.
3. Псіхалагічная функцыя пейзажу.
4. Сімвалічная функцыя пейзажу.

Менавіта ў гэты перыяд праца над даследаваннем ўваходзіць у стадыю завяршэння: афармляюцца матэрыялы, рыхтуецца прэзентацыя і папярэдняя абарона вынікаў выкананай працы. На дадзеным этапе праца цьютара і цьютарнта дасягае максімальнага ўзаемадзеяння, узаемадапаўнення і ўзаемапаразумення. Бо менавіта ад працы на гэтым этапе часта залежыць вынік. Няправільна аформленая праца, непадрыхтаванае выступленне, адсутнасць псіхалагічнага настрою могуць звесці на нуль ўсе стаpанні.

Удала абараніўшы працу, неабходна прааналізаваць вынікі, выявіць цяжкасці і шляхі іх пераадолення. Рамкі тэмы можна пашырыць.

Узрастаючая ў педагагічнай суполцы цікавасць да ідэй індывідуалізацыі і адкрытасці адукацыі дазваляе сцвярджаць, што цьютарства становіцца адным са значных рэсурсаў гэтай мадэрнізацыі, а цьютарскія практыкі – запатрабаванымі.

## Літаратура


1. Ковалёва , Т. М. Профессия «тьютор» / Т. М. Ковалёва, Е. И. Кобыща и др. – М. – Тверь: «СФК-офис».
2. Ковалёва, Т. М. Материалы курса «Основы тьюторского сопровождения в общем образовании»: лекции 1–4 / Т. М. Ковалёва. – М.: Педагогический университет «Первое сентября», 2010.